## Білет 10

**Практычнае заданне.**
**Вялікая Айчынная вайна ў гістарычнай памяці беларускага народа.**

**Выкарыстоўваючы прадстаўленыя матэрыялы, адкажыце на пытанні (выканайце заданні):**

1. Калі завяршылася рэканструкцыя мемарыяльнага комплексу «Хатынь»?
2. Вялікая Айчынная вайна пакінула ў памяці беларускага народа і трагічны, і гераічны сляды. Пацвердзіце гэта меркаванне цытатай з прадстаўленых матэрыялаў.
3. Сфармулюйце два тэзісы, якія пацвярджаюць, што захаванне памяці аб Вялікай Айчыннай вайне – гэта дзяржаўная палітыка Рэспублікі Беларусь.
4. «У нашай гісторыі не было больш яркай і вялікай падзеі, чым перамога над фашызмам. І пакуль людзі памятаюць гэта і ганарацца подзвігам пакалення, якое адстаяла незалежнасць нашай Радзімы, якое выратавала свет ад фашызму, мы ў бяспецы» (А.Р. Лукашэнка). Растлумачце, чаму важна памятаць і ганарыцца перамогай савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне?

**I. З выступлення Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А.Р. Лукашэнкі на цырымоніі ўскладання вянкоў да манумента Перамогі з нагоды 77-й гадавіны Вялікай Перамогі** *(9 мая 2022 г.)*

... Мы памятаем усіх, хто да апошняга патрона стрымліваў ворага на мяжы і каля Брэсцкай крэпасці, пад Мінскам і Магілёвам, хто быў закатаваны ў засценках гестапа, хто згарэў у Хатыні, Дальве і Трасцянцы. Усіх, чыёй крывёю паліта кожная пядзь нашай беларускай зямлі. Гора і смерць прынеслі свету гітлераўскія каты. Нас, беларусаў, рускіх, украінцаў, яны хацелі сцерці з твару зямлі, а заадно з намі яўрэяў, цыган, татар і, на іх думку, іншых «недачалавекаў». Мільёны жыхароў паклала на алтар Перамогі наша вялікая агульная Радзіма – Савецкі Саюз...

**II. З Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь** *(у рэдакцыі ад 15.03.2022)*

Артыкул 15. Дзяржава адказная за захаванне гісторыка-культурнай і духоўнай спадчыны, свабоднае развіццё культур ўсіх нацыянальных супольнасцей, якія пражываюць у Рэспубліцы Беларусь.

Дзяржава забяспечвае захаванне гістарычнай праўды і памяці аб гераічным подзвігу беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

Артыкул 54. Кожны абавязаны берагчы гісторыка-культурную, духоўную спадчыну і іншыя нацыянальныя каштоўнасці.

Захаванне гістарычнай памяці аб гераічным мінулым беларускага народа, патрыятызм з'яўляюцца абавязкам кожнага грамадзяніна Рэспублікі Беларусь.

**III. Усебеларуская маладзёжная будоўля** *(па матэрыялах БЕЛТА)*

Статус Усебеларускай маладзёжнай будоўлі быў прысвоены аб'ектам капітальнага рамонту і рэканструкцыі мемарыяльнага комплексу «Хатынь». Адпаведны ўказ падпісаў Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка.

З ініцыятывай надаць аб’ектам у «Хатыні» статус Усебеларускай маладзёжнай будоўлі да Кіраўніка дзяржавы звярнуліся прадстаўнікі БРСМ падчас звароту Прэзідэнта з Пасланнем да беларускага народа і Нацыянальнага сходу ў студзені 2022 года.

Ва Усебеларускай маладзёжнай будоўлі прынялі ўдзел юнакі і дзяўчаты ва ўзросце ад 14 да 31 года, у тым ліку ў складзе студэнцкіх атрадаў. Будаўніцтва музея на тэрыторыі мемарыяльнага комплексу і рэстаўрацыйныя работы завершаны да 80-годдзя Хатынскай трагедыі.

Трагедыя Хатыні – адзін з тысячы фактаў, якія сведчаць пра палітыку генацыду гітлераўскай Германіі ў адносінах да мірнага насельніцтва Беларусі. 22 сакавіка 1943 года стала апошнім для 149 хатынцаў, у тым ліку 75 дзяцей. У 1969 годзе на 54-ым кіламетры магістралі Мінск – Віцебск у памяць ушанавання ахвяр фашызму на тэрыторыі Беларусі быў адкрыты мемарыяльны комплекс. У ходзе расследавання Генеральнай пракуратурай Рэспублікі Беларусь крымінальнай справы аб генацыдзе беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны і пасляваенны перыяд устаноўлена, што колькасць знішчаных разам з жыхарамі і не адноўленых пасля вайны вёсак - не менш за 216.